БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
СТОЛІНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

Установа адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна"

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ: ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫНЯЙ
## (да 450-годдзя г. Століна)

## Частка 1

БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

СТОЛІНСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БРЭСЦКА-ПІНСКАГА ПАЛЕССЯ: ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫНЯЙ

## (да 450-годдзя г. Століна)

*Зборнік матэрыялаў*
*міжнароднай навуковай канферэнцыі*
*28–29 верасня 2005 года*

*У дзвюх частках*

Частка 1

БрДУ імя А.С. Пушкіна
2006

УДК 930.1 (476) (07)
ББК 63.3 (4Бен)
Г 46

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам
установы адукацыі
«Брэцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна»*

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар **А.А. Гарбацкі**
доктар філалагічных навук, прафесар **В.І. Сянкевіч**

*Рэдакцыйная калегія:*
**А.М.Вабішчэвіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**Ул.А.Сенькавец,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**А.М.Свірыд,** кандыдат гістарычных навук
**Г.М. Ішчанка,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Рэдакцыйная калегія выказвае падзяку начальніку ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама А.С. Рагачуку, а таксама старшыні Столінскага райвыканкама А. А. Дзямко за падтрымку выдання зборніка.

Г-46 **Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна)**: зборнік матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі, Столін, 28–29 верасня 2005 г. У 2 ч. Ч. 1/Брэсц. абл. выкан. кам., Столін. раён. выкан. кам.; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; [рэдкал.: А. М. Вабішчэвіч, Ул. А. Сенькавец, А. М. Свірыд, Г. М. Ішчанка]. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2006. – 352 с.
ISBN 985-473-209-6 (ч. 1)
ISBN 985-473-208-8

У зборнік уключаны даклады і паведамленні міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў г. Століне 28–29 верасня 2005 года, а таксама архіўныя дакументы па гісторыі горада. Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляліся ўпраўленне культуры Брэсцкага аблвыканкама, Столінскі райвыканкам, кафедра гісторыі культуры і рэлігіі, кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства БрДУ імя А.С. Пушкіна.

Выданне адрасуецца вучоным, работнікам органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў культуры, адукацыі, студэнтам, школьнікам і ўсім, хто займаецца вывучэннем, развіццём і захаваннем духоўных, матэрыяльных каштоўнасцей, навакольнага асяроддзя Беларускага Палесся.

Адказнасць за змест і стыль апублікаваных матэрыялаў нясуць аўтары.

**УДК 930.1 (476) (07)**
**ББК 63.3 (4Беи)**

ISBN 985-473-209-6 (ч. 1)
ISBN 985-473-208-8
© БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2006

2. Коялович М. Лекции по истории Зап. России. – М., 1864. – 393с.

3. Карский Е. Белорусы. – Варшава, 1903. – Т. 1. – 466 с.

4. Драгоманов М. Вибране. – Київ, 1991. – 355 с.

5. Кордуба М. Територія і населення України. – Відень, 1918. – 87 с.

6. Рудницький С. Політична географія України. – Львів, 1998. – 185 с.; Rudnizkij S. Ukraina. Land und Volk. Eine gemeinfassiche Landeskunde. – Wien, 1916. – 416 p.

7. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. – Вільня – Нью-Йорк – Менск, Прага, 1998. – Т. 1. – Кн. 1. – 1721 с.

8. Боєчко В., Ганжа О., Захарчук Б. Кордони України: історічна ретроспектива та сучасний стан. – Київ, 1994. – 168 с.

9. Знешняя палітыка Беларусі. – Мінск, 1997. – Т. 1.

10. Лебедзева В. Пратаколы беларуска-ўкраінскіх перамоў аб мяжы // Архівы і справаводства. – Мінск, 2000. – № 5. – С. 93 – 103.

11. НАРБ – Ф. 4. – Воп. 2. – Спр. 1. – Ар. 41 – 42.

12. Канчер Я. Белорусский вопрос. – Петроград, 1919. – 132 с.

*А.М. ВАБІШЧЭВІЧ (Брэст)*

## ПАСЛЯВАЕННАЕ АДНАЎЛЕННЕ СТОЛІНШЧЫНЫ

Вялікая Айчынная вайна прынесла жыхарам Століншчыны незлічоныя, незваротныя людскія і матэрыяльныя страты. Нямецка-фашысцкія акупанты забілі больш за 13 тыс. мірных людзей. Акрамя таго, ва ўрочышчы Стасіна каля Століна было расстраляна карнікамі больш 12 тыс. яўрэяў. На франтах загінула яшчэ каля 2,5 тыс. чалавек. У час акупацыі карнікі спалілі разам з жыхарамі вёскі Беразцы (28 чалавек, 203 двары), Варані (97 чалавек, 137 двароў), Калонію-Расошкі (240 чалавек, 172 двары), Манькавічы (20 чала-

век, 300 двароў), Рубель (122 чалавекі, 730 двароў). Папялішчы пакінулі захопнікі ў вёсках Хотамель, Альманы, Кароцічы, Лутк і, Аздамічы і іншыя. У ваенным ліхалецці былі разбураны многія прамысловыя прадпрыемствы, установы адукацыі, аховы здароўя. Вялікі ўрон панеслі сувязь, транспарт, гандаль.

Аднаўленне знішчанага і разбуранага вайной у Столінскім і Давыд-Гарадоцкім раёнах пачалося адразу пасля іх вызвалення. Ужо ў жніўні-верасні 1944 г. значная частка мясцовага насельніцтва, гужавы транспарт былі прыцягнуты да аднаўлення чыгуначнага маста каля станцыі Гарынь, а таксама мастоў, пабудоў па лініі чыгункі Гарынь-Лунінец. Для пабудовы жылля жыхарамі спаленых вёсак былі бясплатна адпушчаны лесаматэрыялы, створаны 14 будаўнічых брыгад. У 1945 г. было ўзведзена 178 новых дамоў, 279 адрамантавалі. У наступным годзе планавалася пабудаваць 900 дамоў. Нягледзячы на максімальнае напружанне людскіх сіл, за першыя 2 гады аднавіць жыллё не ўдалося. У 1947 г. 164 сям'і працягвалі жыць у зямлянках, 400 сем'яў жылі ў суседзяў ці родзічаў.

Павольнымі тэмпамі ішло аднаўленне мясцовай прамысловасці. Слаба рухалася наперад будаўніцтва цагельных заводаў. Аднак у 1947 г. у асноўным было завершана будаўніцтва цагельнага завода райпрамкамбіната, уведзена ў строй мэблевая фабрыка, адкрыты ліцейны цэх, сукнавалка. Працаваць даводзілася ў нялёгкіх умовах. Напрыклад, цагельны завод райпрамкамбіната не меў інтэрнатаў і рабочыя вымушаны былі хадзіць пешшу на працу за 9 – 12 км.

Дзякуючы самаадданай працы людзей, паціху адраджаліся ўстановы адукацыі. У пачатку навучальнага году (1944/1945) у Давыд-Гарадоцкім раёне аднавілі працу 21 пачатковая і 2 няпоўныя сярэднія школы (3846 вучняў). У Столінскім раёне па стану на 16 сакавіка 1945 г. было 37 школ. Аднаўленне сістэмы адукацыі суправаджалася вялікімі цяжкасцямі. Першачарговай задачай было будаўніцтва і рамонт школьных будынкаў. Востра адчуваўся недахоп падручнікаў,

наглядных дапаможнікаў, школьнага абсталявання, мэблі, паліва. У сярэдзіне ліпеня 1946 г. 25 % школ Столінскага раёна не былі падрыхтаваны да новага навучальнага году. Вячэрняя школа ў Століне не магла нармальна функцыянаваць з-за адсутнасці электрычнасці, газных лямпаў і самой газы. У складаных умовах знаходзіліся выхаванцы дзіцячага дому – яны толькі напалову былі забяспечаны абуткам, адзеннем, не хапала паліва, прадуктаў харчавання.

Няпростым было і кадравае пытанне ў адукацыі, дзе назіраўся недахоп настаўнікаў, недастатковы ўзровень іх прафесійнай падрыхтоўкі. У 1947 г. у 40 пачатковых, 11 няпоўных сярэдніх і адной сярэдняй школе Столінскага раёна, дзе вучыліся каля 8 тысяч дзяцей, працавалі 254 настаўнікі. З іх толькі 8 мелі вышэйшую, 32 – незакончаную вышэйшую адукацыю. Большасць (147 чалавек) мелі сярэднюю адукацыю [1]. З-за матэрыяльнай галечы, аддаленасці школ і іншых прычын частка дзяцей школьнага ўзросту не была ахоплена навучаннем. У 1947 г. у Столінскім раёне было 1635 непісьменных і 1619 малапісьменных дарослых. Для іх былі арганізаваны школы па ліквідацыі непісьменнасці.

Трэба аддаць даніну павагі напаўгалодным настаўнікам, якія самаахвярна вучылі і выхоўвалі дзяцей. «Настаўнікам вельмі патрэбна паляпшэнне харчавання ў сталоўцы, – адзначалася ў адной са справаздач аб матэрыяльным становішчы настаўнікаў Столінскай сярэдняй школы. – ...Выключная патрэба ёсць у абутку, адзенні, пасцельнай бялізне» [2]. Адсутнасць жылля, недахоп паліва, затрымкі на некалькі месяцаў зарплаты таксама абцяжарвалі працу настаўнікаў. У школах часта чыталі замест падручнікаў газеты, іх выкарыстоўвалі ў якасці сшыткаў. Нярэдка на дошцы даводзілася пісаць не крэйдай, а вугалем. Адчувалася ўздзеянне на вучэбна-выхаваўчы працэс ідэалогіі і прапаганды сталінскай таталітарнай сістэмы. Аднак адбывалася гэта павольна. «Многія настаўнікі не наведваюць гурток па гісторыі УКП(б), – сцвярджалася ў адным з партыйных дакументаў наконт СШ № 2 г. Давыд-Гарадка. ... У выніку слабай пастаноўкі антырэ-

лігійнага выхавання ёсць выпадкі наведвання вучнямі царк вы, удзелу ў абрадах» [3].

У пасляваенныя гады былі зроблены першыя крокі ў адна ленні сістэмы аховы здароўя. У 1945 г. у Столінскім раёне дзей нічала бальніца, амбулаторыя, 2 урачэбныя ўчасткі, 3 фель чарска-акушэрскія пункты, ветэрынарная лячэбніца, 2 ветэры нарныя ўчасткі. Урачы і сярэдні медыцынскі персанал пака валі прыклады добрасумленных адносін да сваёй высакарод най і адказнай працы. Умовы дзейнасці медыцынскіх уста ноў былі таксама цяжкія. Насельніцтва пакуль не атрымоў вала належнага ўзроўню медыцынскага абслугоўвання. Час та ўстановы аховы здароўя размяшчаліся ў малапрыстаса ваных памяшканнях. Даволі неспрыяльнай была санітарна эпідэміялагічная сітуацыя. Хоць да масавых эпідэмій не дай шло, але былі распаўсюджаны такія захворванні, як сыпны тыф, малярыя (у Столінскім раёне па стану на 25 мая 1945 г. было 802 выпадкі малярыі), кароста, сухоты і іншыя. Пасту пова становішча выпраўлялася ў лепшы бок.

У першыя пасляваенныя гады слабым узроўнем вызнача лася сістэма гандлю. У крамах адсутнічалі нярэдка тавары першай неабходнасці – абутак, соль, газа, пісьмовыя прыла ды і інш. З-за беднасці людзей заставаўся нізкім пакупніцкі попыт.

Разам з аднаўленчымі працамі ў эканоміцы і сацыяльнай сферы адбывалася адраджэнне культурнага жыцця. Най перш паўставалі разбураныя вайной культурна-асветніцкія ўстановы. У 1945 г. у Столінскім раёне дзейнічалі 20 хатаў чытальняў, кінатэатр, раённая бібліятэка, 2 чырвоныя куткі. Многія з іх размяшчаліся ў прыватных дамах, пры сельсаве тах. Нават у такіх неспрыяльных умовах культпрасветуста новы наладжвалі мастацкую самадзейнасць. Рабіліся заха ды па паляпшэнню кінаабслугоўвання вясковага насельніцт ва. Партыйныя органы дамагаліся актывізацыі культурна асветніцкага жыцця. «Работа з моладдзю запушчана, клуба няма, кінатэатр у занядбаным стане, кінаперасоўка працуе дрэнна, лекцый і дакладаў мала... Моладзь да сённяшняга

часу ў некаторых вёсках ходзіць у царкву...» (з пратаколу паседжэння пленума Столінскага райкома партыі ад 3 чэрвеня 1947 г.) [4].

Значнай падзеяй стала выданне ў Століне раённай газеты. Паводле ўспамінаў аднаго з яе заснавальнікаў М. Бяліцкага, некалькі карэспандэнтаў прыехалі ў Столін 3 лістапада 1944 г., «прывезлі з сабой друкарскую партатыўную машыну, касы са шрыфтамі і скрутак паперы кілаграмаў каля 20...» [5]. На пасяджэнні райкома партыі 10 лістапада 1944 г. выконваючым абавязкі рэдактара газеты «Ленінскі шлях» быў прызначаны І.Р. Хаміцэвіч, 1926 г. нараджэння, які быў прыняты кандыдатам у члены УКП(б) у партызанскім атрадзе. Першы нумар газеты «Ленінскі шлях» выйшаў 26 снежня 1944 г. У першыя месяцы газета выдавалася з вялікімі цяжкасцямі. Невыпадкова, што ў сакавіку 1945 г. партыйныя органы далі нездавальняючую ацэнку працы рэдакцыі. Замест І.Р. Хаміцэвіча, які перайшоў у «Палескую праўду» (Пінск), рэдактарам раённай газеты стаў В.П. Башкатаў. Шмат зрабіў для станаўлення раёнкі М. Бяліцкі, які да 1950 г. быў яе адказным сакратаром. Свой уклад унеслі таксама І.І. Цімашэнка, А. Радзіёнаў, Р.А. Зайцаў, А.А. Агейчык.

Кіраўніцтва аднаўленчай працай ажыццяўлялі партыйныя і савецкія органы. У лютым 1945 г. у Столінскім раёне налічваліся 62 камуністы. З іх 34 былі «усходнікамі» (прысланымі з усходніх абласцей), 28 – з мясцовых партызан і падпольшчыкаў. Усе яны былі служачымі, з іх 20 – супрацоўнікі міліцыі і органаў дзяржбяспекі. Нацыянальны склад партыйцаў быў наступны: 37 рускіх, 18 беларусаў, 7 украінцаў. Паступова партыйныя рады раслі – у студзені 1946 г. было 86, у студзені 1947 г. – 132 камуністы. Хоць сярод папаўнення былі і мясцовыя сяляне, рабочыя, але да іх беспадстаўна праяўляўся недавер. Першым сакратаром Столінскага райкома партыі быў Р.Д. Навіцкі, а пасля яго пераходу ў Пінскі абком з красавіка 1946 г. – А.І. Казіміраў. Старшынямі Столінскага райвыканкома былі А.П. Кувыркоў (да красавіка 1946 г.), Б.С. Ляўчэня (1946 г.), Ц.Ф. Субоцін (1946 г.), П.К. Такма-

коў (1947 г.), С.І. Варкалаў (1947 – 1950 гг.), М.Р. Шалудзько (1950 – 1951 гг.).

Партыйныя і савецкія органы надавалі вялікае значэнне наладжванню грамадска-палітычнага жыцця. Асабліва актывізавалася савецкая прапаганда ў ходзе правядзення выбарчай кампаніі. 10 лютага 1946 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Паводле афіцыйных звестак, у галасаванні ўдзельнічалі 99,9 % выбаршчыкаў Столінскага раёна. З іх за кандыдата ў дэпутаты Савета Саюза А.Я. Кляшчова прагаласавалі 99,65 %, за кандыдата ў дэпутаты Савета Нацыянальнасцей Б.Н. Цяльпука – 99,63 %. Кіраўнік Столінскага райкома Р.Д. Навіцкі паведамляў у абком: «У Плотніцкім выбарчым участку да 5-ці гадзін раніцы прыйшла 96-гадовая бабуля Вабішчэвіч Ганна Пятроўна са сваім 62-гадовым сынам Вабішчэвічам Сцяпанам Адамавічам і заявіла: «Я прыйшла прагаласаваць за нашых лепшых сыноў і пажадаць нашым выбраннікам пражыць такія ж доўгія гады, якія я пражыла» [6].

У сакавіку 1947 г. прайшлі выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Як і чакалася, быў забяспечаны амаль 100 %-ны ўдзел насельніцтва ў выбарах. За кандыдатаў «сталінскага блоку камуністаў і беспартыйных» было пададзена 99,86 % галасоў. У студзені 1948 г. і снежні 1959 г. адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы. Аднак ва ўмовах узмацнення культу асобы Сталіна народаўладдзе насіла фармальны характар. Нярэдка яно абмяжоўвалася партыйнымі і савецкімі ўладамі. 13 мая 1947 г. была прынята пастанова Пінскага абкома партыі «Аб грубым парушэнні сацыялістычнай законнасці ў некаторых раёнах вобласці». Аб такіх фактах на Століншчыне дакладваў на пленуме абкома сакратар Столінскага РК КП(б)Б А.І. Казіміраў.

Нягледзячы на аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці, да пачатку 1950-х гг. было завершана аднаўленне сацыяльна-культурнай сферы Століншчыны. У студзені 1950 г. у Столінскім раёне працавалі 55 школ, з іх 2 сярэднія, 17 сямігодак, 36 пачатковых. Колькасць настаўнікаў павялічылася

да 280 чалавек. Для ліквідацыі непісьменнасці дзейнічала 41 школа. У 1951 г. былі пабудаваны 3 новыя пачатковыя школы ў вёсках Нячатава, Бор-Дубянец, Вялікі Лес, сярэдняя школа ў Беражным. У студзені 1950 г. у раёне працавалі 17 хатаў-чытальняў, раённы Дом культуры, 2 сельскія Дамы культуры, 2 чырвоныя куткі, раённая і 2 вясковыя бібліятэкі. Пры раённым Доме культуры дзейнічаў гурток мастацкай самадзейнасці. Такія гурткі з'явіліся і пры хатах-чытальнях у Варанях і Глінцы. Сярод устаноў аховы здароўя былі раённая бальніца на 70 ложкаў, 3 урачэбна-медыцынскія ўчасткі, 7 фельдшарска-акушэрскіх пунктаў, 1 здраўпункт, малярыйная станцыя і ўрачэбна-бальнічны пункт.

## Літаратура

1. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ) – Ф. 2228. – Воп. 2. – Спр. 124. – Арк. 33.
2. Там жа. – Спр. 8. – Арк. 13.
3. Там жа. – Ф. 2220. – Воп. 5. – Спр. 9. – Арк. 66 – 69.
4. Там жа. – Ф. 2228. – Воп. 2. – Спр. 3. – Арк. 21.
5. Навіны Палесся. – 1989. – 26 верасня.
6. ДАБВ. – Ф. 2228. – Воп. 1. – Спр. 72. – Арк. 2.

*Н.Ф.БЕЛОУС (Брест)*
*С.Н. БЕЛОУС (Минск)*

# О НЕКОТОРЫХ АСПЕКТАХ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО РАЗВИТИЯ ПИНСКОЙ ОБЛАСТИ В ПЕРВОЕ ПОСЛЕВОЕННОЕ ПЯТИЛЕТИЕ (1946–1950-е гг.)

Пинская область была образована в 1939 г. после воссоединения Западной Белоруссии с БССР. В её состав входило 8 городов, 2 городских поселка и 160 сельских советов, 11 рай-